Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ДОЛЯ ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 9 — Вільня, Серада 29-га жніўня 1928 г. — Год 1

Нож у сьпіну.

Апошні школьны год закончыўся для беларускіх гімназіяў у Заходняй Беларусі дужа памысным для іх фактам: пры віленскай гімназіі была створаная ўрадавая камісія, якая праэкзаменавала матурыстаў віленскае й навагрэдзкае гімназіяў і выдала нашым матурыстам атэстаты, расчыніўшыя ім дзьверы ўнівэрсытэтаў у Польшчы.

Характэрныя былі вынікі матуральных экзаменаў: з віленскае гімназіі памысна здалі экзамены *ўсе* матурысты, з навагрэдзкае—з ліку шасьцёх — чатыры. І гэтак урадавая камісія мусіла сцьвярдзіць, што ўсе старыя гутаркі і польскіх школьных уладаў, і польскае прэсы — аб тым, быццам навуковы ровень у віленскай гімназіі лішне нізкі, каб гэтай гімназіі даць правы ўрадавых школаў, — усе гэтыя гутаркі былі зусім пустыя, беспадстаўныя, нязгодныя з праўдай. Гэтак ня толькі матурысты паказалі сваю падгатаванасьць да навукі ў вышэйшых школах, але здала бліскуча экзамен і самая гімназія, даказаўшы не на славах, а на дзеле, што пастаноўка навучаньня ў ей адпавядае ўсім вымаганьням, стаўляным уладай сярэдняй школе.

Здавалася-б, што пасьля гэтага перад гімназіяй адкрываецца новая эра — эра спакойнае й бесклапотнае працы дзеля ўзгадаваньня беларускае інтэлігенцыі, выйшаўшае з народных гушчаў і неразрыўна з імі зьвязанае. Так здавалася... Але-ж аказалася, што варожыя нашаму народу-гарапашніку сілы ня сьпяць. Наадварот: гэтыя сілы крэпка ўзварушыліся, пабачыўшы вынікі першых урадавых матуральных экзаменаў,—і вось пачалі яны шукаць спосабу, каб рашучымі ўдарамі разьбіць самую гэтую гімназію, тым балей нямілую ім, што яна запраўды-ж высака стаіць з пункту гледжаньня пастаноўкі навучаньня.

Шукаць доўга ня прыйшлося: польскія школьныя ўлады маюць даволі магчымасьцяў разьбіць гэту важную для нас культурную пляцоўку, а перадусім даўно выпрактыкаваны спосаб барацьбы з ёй шляхам незацьвярджаньня дырэктара. Мы дужа добра памятаем, як пры закладзінах радашкоўскае беларускае гімназіі кураторыум адкінула аднаго за адным *дзевяць* пададзеных кандыдатаў на дырэктароў, ды зацьверджаны быў толькі *дзесяты*! Відаць, варожыя нам сілы прыпомнілі гэты спрактыкаваны спосаб барацьбы з нашымі школамі, бо, як нас інфармуюць, віленскі куратар рашуча адмовіўся зацьвярдзіць на новы школьны год *старога* дырэктара гімназіі, С. Паўловіча, ужо летась зацьверджанага і даказаўшага свае кваліфікацыі працай мінулага году, якая дала гэткія бліскучыя вынікі на матуральных экзаменах!

Якая-ж прычына гэткага „забракаваньня“ сёлета дырэктара Паўловіча? Як пэдагог, здольны й сумленны, грамадзянін Паўловіч ужо сябе паказаў:—дык *не пэдагогічныя недахопы* прымушаюць адсунуць яго ад кіраўніцтва гімназіяй. Дык можа *палітычная „неблагонадзёжнасьць“*, можа благая „апінія“ паноў дэфэнзыўшчыкаў? *І гэта—не*, бо ведама абсалютна ўсім, што грам. Паўловіч — чалавек зусім непалітычны, што ніякай палітычнай дзеяльнасьцяй не займаецца, ды па свайму сьветапагляду належыць да кірунку вельмі й вельмі ўмяркаванага... Дык што-ж?

Адказ мы ўжо далі: тутака мы маем дзела з воляй нейкіх цёмных сілаў, якія пробавалі захапіць беларускую гімназію ў польскія рукі й пазбавіць яе таго характару ўзгадавальніцы нашае будучае інтэлігенцыі, якую гэтая гімназія цяпер, бясспрэчна, адыгрывае. У працягу мінулага школьнага году зроблены быў рад крокаў у гэтым кірунку. Але спробы гэтыя сустрэліся з дружным, аднадушным адпорам з боку беларускага вучыцельства і грамадзянства — бяз розьніцы палітычнага кірунку. І вось—яшчэ задоўга да афіцыяльнае заявы кураторыуму, што грам. Паўловіч зацьверджаны на дырэктара сёлета ня будзе, грамадзянства *было аб гэтым папярэджана*. Гэтак сама яно папярэджана і аб тым, што кураторыум не зацьвердзіць чатырох вучыцялёў, якія ня здолелі ўжыцца з прыстаўленым да гімназіі агентам „адзінкі“.

Судзячы з таго, што папярэджаньне аб незацьверджаньні дырэктара спраўдзілася, трэба думаць, што спраўдзіцца яно і ў адносінах да гэных чатырох вучыцялёў. І гэтым ударам нашы „паны палажэньня“ хочуць зьвясьці да нуля тое заваяваньне гімназіі, якім была сёлета матуральная камісія.

Мы лічым сваім абавязкам прыпадняць перад вачыма нашых працоўных масаў заслону над усей гэтай справай, каб выявіць запраўднае аблічча „паноў палажэньня“, якія так салодка ўмеюць гаварыць аб сваей прыхільнасьці і спогадзе да беларускага народу. Хай беларускія сяляне й работнікі ацэняць, як сьлед, „шчырасьць“ паноў з „адзінкі“, якія „абяцуюць“ на паперы шмат чаго нашым культурным установам, а адначасна цішком убіваюць гэтым установам *нож у сьпіну*...

Ведама, гэты здрадніцкі ўдар сам па сабе йшчэ не зьяўляецца сьмяротным для гімназіі: мы-ж ужо прывыклі, што блізка кожын год прыходзіцца шукаць новых дырэктароў для аднае ці другое гімназіі. Але ад гэтых штогодных зьменаў кіраўнікоў гімназіі разьбіваецца адзінства й цягласьць вучэньня, і ўсьцяж прыходзіцца нанова навязваць зрываную ніць, а школа перажывае ўсьцяж „дырэктарскі крызіс“. Думаем аднак-жа, што, як у мінулыя гады, так і сёлета, нашая найстарэйшая й найлепшая гімназія выйдзе з гэтага крызісу памысна, што знойдуцца годныя заступнікі выкіданых вучыцялёў, а нашы працоўныя масы падтрымаюць гімназію з свайго боку, пасылаючы ў большым ліку сваіх дзяцей на навуку ў родную школу.

Ад Віленскай Белар. Гімназіі.

Даводзіцца **ДА ВЕДАМА ВУЧНЯЎ**, што здача канікулярных прац (паправан) за мінулы школьны год адбудзецца для вучняў I—IV клясы ў суботу 1-га верасьня, V—VIII клясы ў панядзелак 3-га верасьня.

Пачатак занятказ у-ва ўсіх клясах ў аўторак 4-га верасьня ў 8 гадз. раніцы.

ДЫРЭКЦЫЯ.

III Кангрэс II-га „сацыялістычнага“ інтэрнацыяналу.

Як ведама, нядаўна адбыўся ў Маскве Кангрэс III-га Камуністычнага Інтэрнацыяналу, які ў сваей рэзалюцыі перасьцерагае работнікаў і сялян усяго сьвету перад небясьпекай новай страшэннай вайны, якую гатовіць міжнародная буржуазія, і заклікае іх да арганізацыі і рашучай барацьбы супроць капіталізму.

І вось, так званы „жоўты“ інтэрнацыянал, баючыся каб работніцкія масы не пайшлі за голасам III-га, каб адцягнуць іх увагу і думкі ад гэтага заклiку і аднaчасна падмаляваць і падлатаць прыгожымі слоўцамі свой паблеклы „дэмакратычны“ штандар, каб паказаць, што яны яшчэ існуюць такі на белым сьвеце і зьяўляюцца „правадырамі“ работніцкіх масаў (вярней — гончымі, якія наганяюць дзічыну — нясьведамыя масы на стральцоў — капіталістых) — гэты II-гі „сацыялістычны“ інтэрнацыянал сабраўся 5-га жніўня на Кангрэс у Брусэлі.

Мусім адзначыць, што гэты-ж „сацыялістычны“ інтэрнацыянал быў разьбіўся перад сусьветнай вайной у 1914 годзе, дзякуючы таму, што панкі „сацыялістыя“ паасобных буржуазных краёў падтрымалі імпэрыялістычныя (захватныя) пляны сваіх урадаў, ухваляючы ў парлямантах (гдзе яны былі) крэдыты на гэту бойню і заклікаючы работнікаў і сялян да барацьбы за „слабоду“, „веру“, „рынкі“, супроць „нямецкага варварства“ і гэтаму падобныя „ідэалы“ — які ў якім краі, гледзячы па абставінах і палітычным роўні масаў.

Але гэтая „гульня“ капіталістых пры энэргічным супрацоўніцтве і дапамозе „жоўтых“ сацыялістаў занадта зрабілася газартнай — зацягнулася, выклікала хваробы, голад, разарыла і агалоціла дашчэнту сял.-работніцкія масы ўсіх ваюючых і навет нэйтральных гаспадарстваў у Эўропе, а гэта ў свой чарод змусіла гэтыя-ж масы над многім прызадумацца, узмоцніла рэвалюцыйныя настроі і ў рэзультаце — затрашчэлі і паляцелі царскія троны, кароны, распачалася заўзятая барацьба з капіталізмам унутры краёў і навет (ой, гевалт!) то там, то сям, узяліся і за каўнеры сваіх „абаронцаў“ — панкоў сацыялістых!

Буржуазія не магла даць рады, войска перастала слухаць (прыклад: французы каля Адэсы і англічане на Мурмане падчас блякады ССРР) і тагды яна змушана была часова, пакуль уляжацца рэвалюцыйны ўздым масаў, пакуль паступова ня ўкялзаюць і ня зробяць зноў паслушнай і пакорнай сабе гэтую масу, — перадаць уладу цалком, або часткова панком „дэмакратам“, бо-ж добра ведалі, што ў адпаведны для сябе момант лёгка змогуць алабраць ад іх гэтыя „заваяваньні“. Буржуазія змушана была зрабіць на словах значныя ўступкі і для масы паабяцаць вуснамі сваіх хаўрусьнікаў — „братства“, „слабоду“, палепшаньні долі работнікаў, зямлю сялянам—адным словам, чуць ня рай пабудаваць на сьвеце!

Ну, а панкі „сацыялістыя“, засеўшыя на міністэрскія крэслы, атрымаўшы цёплыя „пасады“ і давай старацца! Пачалі агітаваць, зьбірацца на зьезды, кангрэсы, пісаць, крычаць і ўспакаіваць рэвалюцыйнае мора: цешыць і атуманіваць прыгнечаныя, горэй яшчэ, як перад вайной, масы.

— Мы ўсё зробім — крычалі — улада ў нашых руках, расходзіцеся па дамах і чакайце спакойненька! Капіталізм сам сябе з'есьць, ён сам падгатаўляе варункі да сваёй пагібелі, сам сабе капае яму, а нам і пальцам крануць ня трэба будзе — чакайце і пакуль што, вязіце іх разам з намі на сваіх карках — цярпіце!

І вось гэты Брусэльскі кангрэс зьяўляецца ўжо іхняй III-яй міжнародавай спробай пусьціць пыл, пусьціць гэты дурман даўгацярпеньня і непраціўленьня злу (пазычаны ад клеру) у вочы, у галовы працоўным усяго сьвету.

Шэсьць дзён малолі на гэтым кангрэсе языкамі, круцячыся, як тая рыба на патэльні, баючыся каб моцна не зьбразіць сваіх „старых братоў“ і аднaчасна паказаць сваю „рэвалюцыйнасьць“ перад масамі, а на сёмы (замест адпачынку, паводле бібліі) сьпяклі такі рэзалюцыю і адозву да работнікаў усяго сьвету, зьмест якіх падаем ніжэй у форме інфармацыяў.

У 10-тыя ўгодкі міру.

Усtупны агляд сацыяльна-палітычнага стану сучаснага сусьвету сцьвярджае, што так-званы „мір“, у ім пануючы даў толькі ўсьцяж узрастаючыя збраеньні, якія пагражаюць новай вайной. „Нацыянальныя меншасьці ўсьцяж астаюцца пад уціскам, а вялікія дзяржавы перашкаджаюць іх вызваленчым высілкам, або выкарыстоўваюць іх у сваіх інтарэсах“. „У некаторых краях „дэмакратыя“ задушана дыктатурамі [1]), якія — пры розных мясцовых формах — аднолькава небясьпечныя для вызваленьня пралетарыяту [2]) і сусьветнага міру“. „Паўсюдых, у кожным краі капіталізм, разбойна-прагавіты, як ніколі дагэтуль, сіліцца перакінуць—шляхам несправядлівых, руйнуючых падаткаў, шляхам фінансавых і эканамічных мераў — на карк працуючых масаў цяжары вайны, кідаючы масы ў безрабоцьце і голад.

Магутныя міжнародава-аб'яднаныя — прамысловыя „трэсты“, фінансавыя „картэлі“ кіруюць прадукцыяй і дзяржавамі, — незалежна ад граніцаў. Капіталізм, разрастаючыся ў аграрных краях і калёніях, душыць безбаронны пралетарыят „каляровых расаў“, вызысківаючы яго і карыстаючыся яго таннай працай, як напр. нямецкі і францускі—польскага і беларуск.—і гэтым паніжае заробак эўрапэйскіх і амэрыканскіх работнікаў“.

Усё гэта цалком бясспрэчна, хаця— далёка няпоўна і слаба выражана [3]).

Голас II Інтэрнацыяналу.

Да ўсіх тых, хто церпіць пад гэтай нячуванай дыктатурай капіталізму і пад дыктатарамі палітычнымі, хто жадае міру і сацыяльнай справядлівасьці, II Інтэрнацыянал зьвяртаецца з заклікам, каб—запісваліся ў яго.

— Ад усіх гэтых бедаў, кажа рэзалюцыя, адратуе перамога сацыялізму, які заўсёды назаўсёды—панаваньне працы сярод „пагоджаных у Лізе Народаў паміж сабой вольных народаў“.

Далей рэзалюцыя выхваляе „крамку“ II Інтэрнацыяналу, які падрыхтаваў і асягнуў паразуменьне (буржуазіі?!) вялікіх дзяржаваў Заходняй і Сярэдняй Эўропы — прынцыповую падставу міру“, „разьвязаў (коштам нямецкіх працоўных масаў!) задачу адшкадаваньняў“, амаль ня „вырваў у ўрадаў—агульнае разбраеньне народаў (яўная-ж хлусьня!), абавязковыя міжнародавыя суды і ліквідацыі пасьледзтваў вайны“. Сваей-жа „сацыялістычнай“ крамцы II інтэрнацыянал прыпісвае і—„урачыстае абвяшчэньне вайны міжнародавым праступленьнем“. Але-ж, як ведама ўсім, гэты Трактат Кэллёга створаны буржуазнымі ўрадамі—з пачыну найбуржуазьнейшага з іх—амэрыканскага!—Дый гэта, як ведама, зусім не пагражае дзяржавам усьцяж практыкаваць гэтае „міжнародавае праступленьне“—надалей!.. Дык сама-ж рэзалюцыя II Інтэрнацыяналу дае зьніштажаючую крытыку таго „трактату Кэллёга“, які тут лічыць адным з наймацнейшых ды пажыўнейшых пладоў „працы“ і „перамогі“ сусьветнага сацыялізму брусэльскай маркі. Слушна пратэстуе рэзалюцыя проці выключэньня ССРР з ліку дзяржаваў-закладчыкаў Трактату, дадаючы, што „мертвыя літары яго“ могуць быць ажыўлены толькі тады, калі працоўныя масы здабудуць палітычную ўладу [4]).

---

[1]) Разумей—усунена ад улады і з „цёплых“ мейсцаў.

[2]) А галоўнае, што аднaчасна для кішані і брухаў саміх „дэмакратаў“.

[3]) Але хто-ж дапамог разрасьціся і „ўстабілізавацца“ гэтаму капіталізму, ды душыць безбаронны пралетарыят? Ці запратэставалі хоць раз нашы польскія „сацыялістыя“ супроць каляніізацыі ўсходніх крэсаў? Ці заікнуліся хоць адным словам, калі, падчас гераічнай барацьбы англійскіх вуглякопаў супраць абніжэньня сваіх заробкаў, польскія прамыслоўцы пасылалі ў Англію параходы вугальля і гэтым сарвалі іхнюю справу, — зрабіўшы англійскіх капіталістых больш няўступчывымі? Здаецца, што не!

Ці запратэставалі англійскія „сацыялісты“ супраць душэньня „каляровых народаў“ англійскімі капіталістамі ў Кітаі, Індыі, Эгіпце, ці спынілі гэту акцыю цяпер, ня гледзячы на тое, што гэта лёгка маглі-б зрабіць, загразіўшы агульнай забастоўкай пратэсту? Не! Самі навет, седзючы ў урадзе Балдвіна, пасылалі карныя экспэдыцыі „ашчасьлівіць“ каляровых сваёй „вышэйшай культурай“! Хто-ж, калі ня тыя-ж англійскія „сацыялісты“ таргуюцца цяпер з прамыслоўцамі, каб коштам тых-жа „каляровых“ і не каляровых іншых народнасьцяў, „устабілізаваць“ іхнюю прамысловасьць, ды налажыць вывазныя мыты на тавары? Здаецца, яны самыя!

Чаму францускія „сацыялісты“ маўчалі падчас, як іхняе войска бязлітасна бамбардавала і душыла паўстанча-вызваленчы рух у Марокку? Таму, што сацыял-угодлa ўсіх краёў, увесь другі жоўты Інтэрнацыянал падтрымлівае палітыку сваіх капіталістаў, а гэтым вышэйсказаныя словы зьяўляюцца толькі „кракадзілавымі сьлязамі“, ёсьць толькі пустым гукам, жаданьнем пусьціць пыл, не адарвацца зусім ад масаў, ня страціць аканчальна свайго ўплыву на работнікаў, каб яны не пайшлі на прызыў III Інтэрнацыяналу!

[4]) Здабывайце, але ведама-ж пад кіраўніцтвам „сацыялістаў“, якія яе перададуць „наступаючаму фашызму“ — буржуазіі. Ну так што-ж? Вы, працоўныя, яшчэ раз здабывайце, а яны яшчэ раз здрадзяць, тагды трэці раз здабывайце і так без канца! Забаўная, як бачыце, штука.

Угода пачынае „страшыць“.

Калі прыглядзецца да работніцкага і сялянскага руху па ўсёй Эўропе, дык кідаецца адразу ў вочы тое зьявішча, што масы „палявеюць“.

Чаму так сталася? Па-першае, цяжкі эканамічны быт, беспрацоўе, узмоцнены, дзякуючы капіталістычнай рацыяналізацыі, высілак працы; па-другое, палітычны ўціск, які, дзякуючы рэпрэсіям, заваструе барацьбу работніцкай клясы за свае правы.

Доказам гэтага „палявеньня“, могуць служыць выбары да парлямантарных установаў у Францыі, Нямеччыне, Польшчы і г. д., дзе, па пэўных прычынах, хоць мала праведзена „крайне лявіцовых“ пасло́ў, затое шмат людзей галасавала за іх.

Работнікі і сяляне пераходзяць на бок тых партыяў, якія больш рашуча, бескампрамісова вядуць барацьбу за палепшаньне іх долі.

Аднача́сна ўцякае грунт з пад сацыял-угоды. Працоўныя, пераходзячы зусім „налева“, пакідаюць сацыял-угоду, дэмаскуючы яе ўгодавыя дзеяньні, ашуканскія лёзунгі, якія выкрываюцца толькі „для вока“. Але сацыял-угода ня хоча пакінуць сваёй ролі— адкрыта або закрыта служыць буржуазіі і здраджаць працоўнай клясе: яна ратуе сваё палажэньне.

Першым чынам, „вострая апазіцыя“ да ўраду, сялянскіх зьездаў, кангрэсаў, дзе прыймаюцца „вострыя“ рэзалюцыі, лезыя лёзунгі і г. д., словам угода „радыкалізуецца“, „лявее“.

Як факт, які яскрава сьведчыць аб гэтай „радыкалізацыі“ і „палявеньні“ сацыял-угоды, будзе вельмі цікавая рэзалюцыя „Stronnictwa Chłopskiego“, прынятая на паседжаньні акруговай рады ў Дубецку і апублікаваная у „W i P e“ (Варшаўская Прэсовая Інфармацыя) у № 27 (62) стар. 363, якая дае цікавую характарыстыку маршалка Пілсудскага, і якая асьмелілася яго страшыць навет катастрофай Польшчы!

У пункце 4 і 5 гэтай рэзалюцыі чытаем:

4) Шкадуем слоў і апошніх чынаў Пана Маршалка Пілсудскага, якія паставілі Яго ў радох ворагаў народных мас. У Маршалку Пілсудскім яшчэ нядаўна бачылі мы прадстаўніка ідэі вялікай і дэмакратычнай Народнай Польшчы і абаронцу людзкіх правоў селяніна і работніка. Трывалі пры ім нязломна ў найцяжэйшых мамэнтах для яго і Польшчы, тады, калі тыя, якіх цяпер падтрымоўлівае і ў рукі якіх аддаў кіраўніцтва дзяржавай, публічна на мітынгах называлі яго „бандытам“, „жыдоўскім дзядзькам“, „бальшавіком“ (?) і г. д. За сымпатыі да Маршалка цярпелі мы ад магнатаў самыя розныя перасьледаваньні і зьдзекі, але трымаліся сьмела каля яго боку, верачы, што перамога Маршалка будзе перамогаю дэмакратыі ў Польшчы. Цяпер Маршалак Пілсудскі даказаў нам, што яго намеры ідуць зусім у адваротным кірунку. За тое, што нашыя паслы абаранілі (???) сялянскую беднату ад новых падаткаў, Пан Маршалак хоча тых нашых паслоў „біць і капаць безустанку“. Урачыста сьцвярджаем, і каб гэты наш голас дайшоў да Цябе, Пане Маршалку Пілсудскі, (вось-жа—рэзалюцыя пісалася не для народу, а для п. Маршалка. Р э д.):—„Гэта ня нашых паслоў, а нас, сялянска-работніцкія масы, хочаш „bić i kopać“, Пане Маршалку, бо мы іх, тых нашых паслоў, выбралі і паслалі ў Сойм, каб кантралявалі кіраваньне Дзяржавы і ўстанаўлялі для яго права. Такімі выступленьнямі капаеш, Пане Маршалку, гроб Польскай Дзяржаве“.

5) Даручаем паном паслом зрабіць усялякія стараньні і высілкі, маючыя на мэце зьліквідаваньне канкардату з Рымам і аддзяленьне касьцёлу ад Дзяржавы, — бо пры цяперашнім ладзе і палітыцы клеру Польская Дзяржава ў нядоўгім часе можа кончыць сваё жыцьцё. Як бачым, „Stronnictwo Chłopskie“ да таго ўжо перапалохалася, што навет страшыць упадкам польскай дзяржавы.

Пэўна-ж самы чытачы зразумеюць гэтыя страшакі!

Пётра Жвір.

З гэтага поваду праф. саюз зьвярнуўся да цэху майстраў з заклікам сабраньня канфэрэнцыі дзеля абгаварэньня і ўрэгуляваньня гэтых патрэбаў.

Работнікі дамагаюцца.

У мінулым тыдні адбылося веча работнікаў скуранага промыслу ў Варшаве. На вечы было больш 600 прысутных работнікаў. Выслухаўшы цэлы шэраг прамоваў, веча пастанавіла наступную рэзалюцыю: дамагацца ў першай чарзе надбаўкі сталай платы на 20 проц., прафэсіянальнай помачы ў колькасьці 7 зл. і не прафэсіянальнай у колькасьці — мінімум 4 зл. Далейшыя жаданьні — абнімаюць: рэгуляцыю цэнніка, справу прыняцьця работнікаў работніцкімі саюзамі і справу правядзеньня ў фабрыках суадказных санітарных палепшэньняў.

Як бачым, дык работнікі не спадзяюцца ні на якія панскія абяцанкі—ні на перадвыбарныя, ні на павыбарныя,—а толькі на ўласныя сілы, на шляху здабыцьця належных ім чалавечых правоў і варункаў жыцьця.

Ці-ж ня добра памаглі сабе паны сваімі абяцанкамі — ці ня гэтым яны пашырылі і пашыраюць клясавую сьведамасьць сярод працоўных?!

Камуністычная „дэкарацыя“.

Па весткам варшаўскай прэсы, 23 жніўня гарадзкая паліцыя зьняла 3 камуністычныя сьцягі з антыдзяржаўнымі лёзунгамі. Усе яны віселі на тэлефонных дротах (адзін на трамвайным правадніку), на розных (трох) вуліцах.

Сьцягі адасланы да „zbiorów“ (зборнікаў) паліцыі.

Лесапілкі гараць.

У Новым Томысьлі згарэла аж да фундамэнта вялікая паравая лесапілка нейкага Нетшэ. Апрача машынаў, згарэла многа дзерава. Прыпушчальная прычына — умыснае падпаленьне.

Таксама з няведамай прычыны згарэла датла вялікая паравая лесапілка Дэўніча ў Тамашове пад Вронкамі (вядомымі беларусам).

Апрача машынаў, згарэла больш 10 вагонаў дошак.

Радавыя лятуны ў Коўне.

У Коўну прыляцелі 2 радавых лятуны, якіх гучна спатыкалі прадстаўнікі ўраду і публіка. Гэта—першая візыта радавых авіятараў у Літве.

Нямецкі журналіст аб польска-літоўскім споры — з нямецкага пункту гледжаньня.

Цікаўным дапаўненьнем гэтай „гутаркі“ Вальдэмараса зьяўляюцца цікаўныя меркаваньні ведамага маскоўскага карэспанд. „Бэрлінэр Тагэблат“, які высьвятляе дакладна, чаму Нямеччыне і ССРР канешна патрэбна захаваньне нятыкальнасьці Літвы і зварот ей Вільні.

„Для Нямеччыны Літва мае такое самае значэньне, кажа п. Шэффэр, як для Англіі Эгіпет і Чырвонае мора: толькі праз Літву Нямеччына можа дыхаць паветрам — у адзіным пакінутым для яе кірунку—ўсходнім... Калі-б Літва была паглынена Польшчай—гэта выклікала-б цэлы сьцяг розных небясьпекаў для Нямеччыны. — Усходняя Прусія была-б цалком зьвязана ў сваіх руках Польшчай, а з часам—і цалком адарвана ад Нямеччыны. Апрача таго, уся камунікацыя, увесь транзыт паміж Нямеччынай і ССРР апынуўся-б тады ў залежнасьці цалком ад Польшчы, у руках якой быў-б цалком кантроль над усім гаспадарчым абменам між Нямеччынай і ССРР. З боку ССРР, цьвердзіць п. Шэффэр, пагроза захвату Польшчай Літвы выклікае такія самыя страхі і меркаваньні. „Калі Нямеччына, канчае аўтар, падпісала без усякіх спэцыяльных засьцярогаў Трактат Кэллёга, дык пэўне-ж мае права трэбаваць, каб такі важны для яе інтарэсаў польска-літоўскі канфлікт ня быў-б вырашаны—з крыўдай для гэтых інтарэсаў“. У заключэньне аўтар трэбуе канешна запрашэньня да падпісаньня Трактату ССРР — бо-ж толькі тады Трактат атрымаў бы рэальны зьмест проці — ваеннай ўмовы. Напрыклад, — учасьце ССРР у трактаце Кэллёга адразу выключае ўсялякую магчымасьць выступленьня Польшчы проці Літвы...

Разважаньням п. Шэффэра, які лічыцца амаль ня найспрытнейшым з нямецкіх журналістаў, ня можна адмовіць у цікаўнасьці.

Левая прэса аб Трактаце Кэллёга.

„Рабочая Газэта“ заяўляе, што Трактат Кэллёга—бяз подпісу ССРР — будзе толькі простым кавалкам паперкі. Усе дзяржавы, кажа газэта, зьвязаны з ССРР, ня толькі гаспадарча, але і палітычна, ці прызнаюць яны гэта афіцыяльна, ці не, гэта — усё роўна. Дык заключэньне такога важнага палітычнага акту без ССРР—ня мела-б ніякага наважнага значэньня.

Англійскія вугальныя каралі робяць стаўку... на забастоўку вуглякопаў у Польшчы.

Дагэтуль заўсёды вінавацілі ў-ва ўсіх забастоўках на сьвеце — маскоўскіх камуністаў. Але вось — узгарэлася вайна паміж англійскімі і польскімі вугальнымі прамысловцамі—за заняцьце Польскім вугальлем— у часе вялікай англійскай забастоўкі — вугальныя рынкі. Меншасьць англійскіх прамыслоўцаў прапануе паразуменьне з польскімі—мірны падзел рынкаў. Але большасьць пастанавіла—праца́ўжаць вострую барацьбу без усялякага пардону, спадзяючыся, што— ў хуткім часе выбух агульнай забастоўкі сярод польскіх вуглякопаў канчальна заб'е здольнасьць Польшчы да канкураваньня з англійскім вугальлем... Дык—трэба прадбачыць, што ў будучых перагаворах англійскія прамыслоўцы будуць усякімі спосабамі за-

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Зьмена соймавага рэгуляміну.

Па весткам прэсы, клюб Б. Б. апрацоўвае цяпер праект зьмены соймавага рэгуляміну.

Праект мае быць паданы ў Сойм увосень, разам з праектам зьмены Канстытуцыі; тычыцца ён галоўным чынам спосабу ўсталеньня народаў.

Выезд мін. Залескага ў Парыж і Жэнэву.

У пятніцу, 24./8. г. г. польскі міністар загран. спраў Залескі выехаў у Парыж дзеля падпісаньня „проціваеннага“ пакту Кэллёга.

Па падпісаньні гэтага пакту і па некальніх канфэрэнцыях з палітычнымі дзеячамі Эўропы, Залескі выедзе з Парыжа ў Жэнэву на васеньнюю сэсію Лігі Народаў.

Туды-ж (у Жэнэву) прыедзе ў канцы жніўня і польская дэлегацыя, старшынёй якое зьяўляецца мін. Залескі.

Ланьцуцкі ізноў ў вастрозе.

Нядаўна звольнены з турмы на падставе амністыі, былы камуністычны пасол Ланьцуцкі, ізноў арыштаваны і пасаджаны ў турму на Дзельнай вуліцы (ў Варшаве), у так званы Павяк.

Паводле прэсы, Ланьцуцкі арыштаваны за „нейкае“ правіненьне на правінцыі, якога амністыя не абнімае....

Францыя запатрабавала.

Апошнімі днямі з Францыі ў Польшчу прышло запатрабаваньне на новыя нявыкваліфікаваныя работнікі ў капальні вугля.

Ізноў групы сялян і работнікаў Польшчы адарвуцца ад сваіх сем'яў і Бацькаўшчыны і пойдуць пад вызыск чужаземнай буржуазіі, у лапы якой гоняць нэндза і ўбоства ў хаце. Ці знойдуць там рай — няма ведама...

Арганізованасьць узрастае.

Саюз варшаўскіх работнікаў спажывецкага промыслу прыступіў апошнімі днямі да акцыі, маючай на мэце ўнармаваньне варункаў працы і платы работнікаў, працуючых у пекарнях і цукернях Варшавы.

Ужо з'арганізаваны спэцыяльныя лётныя камісіі, якія сьцвердзілі частыя „прыпадкі“ ламаньня працадаўцамі 8 гадз. работніцкага дня, нізкі заработак працаўнікоў і навет невыконваньне ўстававаўства аб працы: недаваньне належных адпачынкавых адпускоў.

Заграніцай.

Што бачылі ў Вільні літоўскія карэспандэнты (?)

Як ведама, у Вільню — на зьезд легіянераў—прыяжджалі аж 7 карэспандэнтаў ковенскіх газэтаў. Цяпер, вярнуўшыся ў Коўну, яны, як падае польскае агенства „АТЕ“, пішуць, што ўся ўрачыстасьць мела характар выразна проці—літоўскі, што пасьля прамовы марш. Пілсудскага легіянеры выйшлі на вуліцу, падняўшы крыкі: „Мы хочам ісьці на Коўну“... Апрача таго, ковенскія карэспандэнты цьвердзяць, быццам—у адлегласьці 8 кілям. ад польска-літоўскай граніцы яны бачылі будаваныя палякамі ўкрапленьні, што ўказывае на падрыхтаваньні Польшчы да вайны з Літвой... Польскія газэты кажуць, што ўсе гэта—хлусьня.

Ваенная трывога на Радавым пагранічы—ў часе віленскага зьезду легіянераў.

З Масквы даносяць, быццам—у зьвязку з адбыўшымся ў Вільні зьездам легіянераў і спадзеваным „рашучым крокам“ з боку Пілсудскага адносна да Літвы,—удоўж усей радава-польскай граніцы былі прыняты экстраныя меры поўнай гатоўнасьці — на ўсялякі выпадак...

„Сынкі“ і „пасынкі“.

(Фэльетон).

12-га жніўня адбыўся ў Вільні зьезд легіяністаў. Маршалак Пілсудскі сказаў у Вялікім тэатры прамову поэтычна-ідылічнага характару.

(З газэт).

У нядзелю адбыўся зьезд легіяністаў!.. Каго цешыць, каго сьмешыць, а нас „неправаверных“ беларусаў дык гэты зьезд вельмі палохае: арыштуюць, думаем, ня можа быць каб такая „ўрачыстасьць“ бяз гэтага абыйшлася!

Ходзін, як той казаў—мухі ў польскім сойме, папусьціўшы галовы, варожым на пальцы, а некаторыя спэцыялісты—на карты, па зьвёздах — арыштуюць, ці не? Гдзе-якія са сваіх кватэраў пазьяжджалі, а ў мяне, браткі, як на грэх, у кішані слабавата, а бяз гэтага куды, думаю, скочыш? Буду сядзець на мейсцы, „да будзе воля твая, камісарыяце“! Ад чацьвярга не паказваюся з кватэры, каб, знача, ня кінуцца ў вочы! Сны ўсе такія страшныя віджу! Прыпёрлі, здаецца, паліцэйскія, стукаюць у дзьверы, а на двары чорны аўтамабіль гудзіць! Страшна зробіцца, ажна кроў становіцца ў жылах,—ускакваю бяз памяці з пасьцелі, слухаю ні жывы, ні мёртвы, ажна, слава табе цецеру, ня праўда, гэта толькі сон такі бачыў, думаю!

У суботу купіў сабе на ўсялякі выпадак пяць кіль хлеба, тры пачкі махоркі—запакаваў, пахаджваю па пакоі, чакаю „гасьцей“—вядома-ж ня з надта вялікай прыемнасьцяй! Ажна і сонейка заходзе—нет, і цямнее—нет, і ночка настала—нет, што за ліха, дзіўлюся! Няўжо на гэты раз пройдзе, нас не зачапіўшы, гэта „туча грозная“?! Ня верыцца! Гэту ноч дык і не разьдзяваўся, браткі мае, прылягу, здрамну крыху, а чуць, што, дзе-небудзь шургане, стукне—зрываюся на ногі слухаю, топаю, не магу заснуць, дый так і прамучыўся цалюсенькую ноч, да раньня. Пасьвятлела на дворэ—пасьвятлела і ў мяне на сэрцы, думаю: „мусіць абмінула такі“!

Заснуў гадзінку, памыўся, каб вочы ня былі такія чырвоныя і паляцеў да знаёмага, таксама „неправавернага“ —І ты дома?! дзіўлюся і радуюся разам.

— Ня верыш вачам, дык пашчупай! — жартуе—але, прошлай ночы, кажа, некалькі хлапцоў такі „прыгарнулі“!

— Але-ж ня ўсіх, як тагды... і за гэта кажы дзякуй!

Направіўся ў харчэўню паабедаць. Прашу на-павер. — Так і так кажу, пане, няшчасьце вось мучыла: ўсе грошы выдаў на хлеб—махорачную загатоўку! Корчыцца нешта—віджу ня хоча. — Калі-ж ужо ня верыце, дык магу махоркай... — Паморшчыўся, паморшчыўся, але ўсё-ж такі згадзіўся пачакаць. Абедаю.

Насупраць мяне, за другім сталом сядзяць у чатырох нейкія панкі ў мапішках. На стале ў іх бутэлька „гаручкі“, піва—усе, як сьлед, выпіваюць, закусваюць, гаманяць...

А-а! — дагадаўся я, гэта-ж пэўне на зьезд прыехаўшы, падбадраюцца!

Як на злосьць, у гэты ўрачысты дзень, пагода выпала нояк... зусім не „ўрачыстая“. Цалюсенькі дзень цымбурыў дождж,—аддыхне трошкі, дый зноў, як жарне, ажно бурбалкі падскакваюць у лужынах! Бедныя легіянеры! Бачыў, йшлі. Так, што, як бачыце, дождж тут для гэтай урачыстасьці мала шкодзіў. Мне асабіста, дык ён, каб яго ліха, даўся ў знакі! Вытаркнуў галаву праз вакно і віджу, што ўжо павінна быць шостая гадзіна (я, бачыце, час вылічваю на „вока“, бо-ж на гадзіньнік ніяк не магу зажыцца!), трэба йсьці да тэатру слухаць прамову, а як тут выйдзеш, калі, як з вядра, дубасіць дождж?

Чакаю, чакаю,—не перастае, каб на яго пропасьць! (у сёлетнім годзе). Пасьля адважыўся, махнуў рукой—эт, думаю, ня цукровы,—не распаўзуся! Яно навет гэткая ванна і для здароў'я карысна, быццам з „пляжы“ (так называецца купальня з пясчаным берагам мора, або возера) вярнуся да хаты. Ажна толькі вийшаў з брамы, чую нехта кліча — пане Яне! Янук! — Што за праява? Агля́нуўся, аж бачу сусед, Антось, стаіць перада мной!

— Як маешся, браток, як гадуешся? Паклон табе бацькі прыслалі! — Прывітаўся, падзякаваў за паклон. — Якім цудам — пытаю—трапіў да нас у Вільню?

— Ды вось, браток, на гэты-ж суд на заўтра цягнуць!

— Які суд? З якога артыкулу?

Не за арцікулу, а за пасьвішча пан падаў! Сёлета ён нам забараніў, кажа—ліквідацыя; досыць вы і так маімі выгаркамі пакарысталіся!—ну, а мы пасьвілі, бо куды-ж з быдлам дзенешся?—Вось у чым справа!

А я да цябе—адрас далі, можна перанача́ваць...

— Ай, не, не! Ня можна пане Антоні! І для цябе можа быць кепска і для мяне бяда! Лепш ужо...

— Чаму так? Цесна?

— Не, ня тое! Бачыце, мая кватэра „трэфная“—зараз падумаюць, што які шпіён прыехаў! Пойдзем весь Пілсудскага гутаркі слухаць!

— Яно-ж можна ад нечага рабіць і паслухаць, але-ж вось дождж дубасіць!

— Глупства! У мяне відзіш які андарак і то не баюся, а васпанаву сьвітку і вядром льючы не прамочыш!

— Пойдзем сабе—неяк неахвотна згадзіўся Антось.

Валім па Тэатральнай вуліцы, аглядваючыся, можа „абронца“ ідзе па пятах, аж не, ня відаць.

Бачым, недалёка ад тэатру чалавек пяцьдзесят конных, трымаюцца за вуздэчкі на чаку, вось, вось, здаецца, гатовы скочыць на коні і гайда!

— А гэта якое войска, амэрыканскае нейкае ці што?—пытае мой сябар.

— Ці-ж сам ня бачыш? Прыглядзіся добра!

— А-а! Гэта, знача, каб усё было ў парадку, разумею! А гэта якая буда чорная стаіць? Аўтамабіль, лаўкі ў сярэдзіне... ці ня скорай помачы гэта?

— Так, скорай помачы... на Лукішкі! Можа маеш ахвоту праехацца?

— Што ты, браток! Згінь ён, прападзі, каб яго ня чуць, — ня відаць! Адышлі, а мой Антон усё касіўся на гэту „буду“.

Што бліжэй да тэатру, то больш паліцыі і сярод вуліцы і па хадніках ходзяць, круцяцца.

— Глядзі, глядзі, Янук! Які гэта аўтамабіль чырвоны? Нешта на ім напісана! — Чытаю „Filips Radjo“. Гэта—тлумачу — тут, мусіць, машына, што перадае размову Пілсудскага—радыё.

— А што ён тутака ў ім сядзіць?

Ды не! Ен у тэатры, а туды відзіш вун драціна праведзена, дык па ёй знача і перадаецца.

Цісьнемся да самага ўваходу, аж тут кругом, браткі мае, афіцэры, паручыкі, паліцэйства нейкае старшае ў галунах, паны брухатыя ў цыліндрах—пагля́даюць на нас, ажна мне неяк нялоўка стала. Аглядаюся наўкола, ці ня ўбачу дзе грамадку „нашых“ такіх самых галадранцаў, як мы, але, як на сьмех, ані ваднюткага ня відаць!

— Дзе тут нехта гавора? — пытаецца, гледзячы ўгару мой сябра.

— А вунь, бачыш, на бальконі чырвоную скрынку? Гэта Пілсудскі...

— У гэтай скрынцы?! Ды там быццам два ў вадно горла крычаць!

цягваць справу, каб — дачакацца спадзяванай забастоўкі.

Новыя проці-італьянскія маніфэстацыі—у Югаславіі.

Зацьверджаньне югаслаўскім „парлямантам“ (пры адсутнасьці больш, як траціны яго — апазіцыйнага блёку) выклікала ў розных месцах краю маніфэстацыі, скіраваныя проці Італіі, якая змусіла югаслаўскі ўрад падпісаць непапулярны трактат з Італіяй. 15 жніўня адбылася лічная дэманстрацыя ў Спліце, у часе якой добра набіты быў італьянскі консул! Італьянскі пасол у Белградзе зараз-жа заявіў пратэст і патрэбаваў „сатысфакцыі“ і пэўне-ж — адшкадаваньня. Італьянскі пасол ставіць у віну югаслаўскаму ўраду і тое, што — у цэлым шэрагу местаў Далматыі адбыліся дэманстрацыі пратэсту проці гэтага Трактату, а так-жа — проці Лігі Нацыяў...

Цікаўныя нарады ў Будапэшце.

У Будапэшт (сталіца Вэнгрыі) прыехаў турэцкі міністар загран. спраў, які распачаў палітычныя нарады з прэм'ерам вэнгерскага ўраду і з яго мін. загран. спраў, побач з мін. замежных спраў Баўгарыі. Турэцкага міністра вельмі ўрачыста частавалі ў Будапэшце. На запытаньне аднаго з журналістаў, сколькі праўды ў чутках аб рыхтаваным трактаце паміж Турцыяй, Югаславіяй, (Вэнгрыяй) і Нямеччынай, турэцкі міністар адказаў, што стасункі паміж імі такія добрыя, што лепшых няма чаго жадаць. Але дзіўна было-б, каб гэтыя найлепшыя стасункі ня шукалі для сябе праўнага выразу ў заключэньні спэцыяльнага трактату...

Павадыр славацкіх „людоўцаў“—першым арцыбіскупам Славакіі.

Павадыр славацкіх „хрысьціянскіх дэмакратаў“ — каталіцкіх людоўцаў кс. Глінка экстрана выкліканы папай у Рым—„дзеля справаздачы“. У палітычных колах Славакіі думаюць, што справа ідзе — аб намеры папы стварыць славацкае арцыбіскупства, пры чым кафэдра гэтая была-б запрапанавана кс. Глінцы.

Калі-ж гэта наш кс. Станкевіч дачакаецца прынамсь хаця—біскупскай катэдры—першай у Беларусі. Як ведама, быў час, калі з гэтай думкай насіліся і ў краі і ў Рыме, намячаючы на біскупа, здаецца, кс. Абрантовіча.

Усе-кітайскае Нацыянальнае Сабраньне.

Кангрэс кітайскіх нацыяналістаў (Куомінтангу) ў Нанкіне закончыўся 15 жніўня. Найважнейшая пастанова кангрэсу трэбуе, каб на дзень 1-га студзеня 1929 г. было склікана Усекітайскае Нацыянальнае Сабраньне, у якім маюць прымаць учасьце дэлегаты ўсіх кітайскіх зямель, не выключаючы Манчжурыі (!) Манголіі і Тыбэту.

Японія „купляе“ манчжурскі ўрад.

Баючыся распачатай у Манчжурыі агітацыі—на карысьць аб'яднаньня ўсіх краёў Кітаю над адзінай дзяржаўнай уладай — Японія прымае ўсе меры, каб забясьпечыць сваё панаваньне ў Манчжурыі, стрымаўшы гэты кавалак Кітаю ад злучэньня з рэштай краю. Апрача чыста ваенных мераў, японскі ўрад, як даведалася англійскае агенства, мае намер даць значную пазыку манчжурскаму ўраду—60 мільён. іенаў (рублёў)—пад заставу манчжурскіх чыгунак.

Але, як кажа тэлеграма, гэта пазыка, якая мае пайсьці на будаваньне сеці новых чыгункавых ліній—пэўне-ж перадусім стратэгічнага значэньня—на карысьць Японіі, — мае быць дадзена толькі—„пасьля стабілізацыі палітычных стасункаў у Манчжурыі“... Што значаць гэтыя модныя цяпер выразы, добра ведама: гэта значыць—сьпярша пакарысь цалком азброенаму да зубоў японскаму банкіру-імпэрыялісту, а тады атрымаеш грошы—на закрапленьне гэтай няволі навек—шляхам чыгункавых шляхоў, якія здолеюць... маланкай падвозіць японскіх жаўнероў і японскія пушкі—у любы пункт краю...

Японскі ўльтыматум Мукдэнскаму ўраду.

Сын Чанг-Тсо-Ліна, які стаў „дыктатарам“ Манчжурыі, фактычна аказаўся яшчэ больш пакорным, як яго бацька, наймітам Японіі. Сьпярша ён адгукнуўся на заклік Нанкінскага ўраду і заключыў з ім умовы—аб спыненьні вайны і аб супольнай працы над аб'яднаньнем Кітаю. Тады Японія, што называецца—„паказала свае пазуры“. Японскі ўрад паслаў „дыктатару“ ўльтыматум — безадкладна парваць умову з Нанкінам, пагражаючы ў праціўным разе расправай. Як і трэба было спадзявацца, сын, ведаўшы, што яго бацька забіты па загаду японскага ўраду — за спробу самастойнай палітыкі і спробу пагадзіцца з павадырамі паўдзённага Кітаю, пакорна споўніў трэбаваньне Японіі...

Але — ці пагодзяцца з гэтым дзеячы нанкінскага ўраду, яшчэ няведама. Ці будуць таксама спакойна глядзець на захват Японіяй Манчжурыі — Амэрыка, Англія і СССР, гэта—таксама пытаньне:

Чанг-Тсо-Ліна забілі японцы.

Вялікую сэнсацыю зрабіла ў Пэкіне заява англійскага пісьменьніка, знаўцы манчжурскіх стасункаў, што замах на цягнік, каштаваўшы жыцьця Чанг-Тсо-Ліну, зроблены па загаду японскіх мілітарыстаў. Запраўды ж—цікаўны канец „шчырага“ японскага наймітаі..

Наш край.

Балоты... горы... камень... лес...
Палоскі... межы... дарогі... сьцежкі...
Палац... маёнткі і сады.
А нэндзы, нэндзы, колькі нэндзы!..
Мяжа... бяда... гаротнік... сьлёзы...
Пярун... навальніца... пажар...
Падаткі... град... прапаўша збожжа...
Дзяруць і поп, і бог, і цар.
Вайна... жаўнер... сіроты... ўдовы...
Масты... дарогі і абоз...
Ланцуг ваеннае аковы...
Забойчы крык, крывавы дух.
Гарматы... кулі... кроў... акопы...
Шпіталь... магілы... і храсты...
Наезды... конніцы, пяхоты...
Забіты конь, хіжацкі воўк, у паветры
каршуны...]
Ідуць... бягуць... пустыя хаты...
Адны адходзяць... немцы йдуць...
Гучыць... грыміць па ўсім дарогам,
Хватае сьмерць і там і тут.
Дарогі, сьцежкі, ўсе заліта
Людзьмі, скацінай, ўсё бяжыць...
Сплялось, зьмяшалась, крыкі, енкі...
Адкуль? Куды?—тут шлях ляжыць.
Чыгунка... Станцыя... вагоны...
Масква... Казань... Сібір... Урал...
У паветры зык вайны шалёнай,
Наш край пусты! У вагні наш край!
Вякі... гады... ўсе той дарогай
Французы... Швэды... Немцы й курганы
Што раз, то сьведчаць аб рэзьні новай,
Аб йзноў разьліўшайся крыві...
. . . .
Ізноў палоскі... межы... камень... горы...
Парослы лесам і дзярном
Пусты надворак... Бяда... сьлёзы...
На ўсім краі стаяць кругом.
Каня няма, засеяць трэба.
Усё пустуе у палёх...
Сям'я, малыя дзеці, няма хлеба,
Бяда бязрадна і боль ў грудзёх.
Гады... пакута... адбудова...
Няволя... гнёт... падаткі... войска...
Дварцы... палацы і абшар —
Прыладзьве сьмертнага забойства
І голад страшны гаспадар...
. . . .
Мы будаўнікі! Мы жыцьцё новае нясём!
Нам сьветлых дзён патрэба,
Мы брацьця сьвету паўстаём
На зьлітай потам, кроўю роднай глебе
Яго на новы лад мы заснуем!

Дуброва.

Вячэрняю парой.

Пагасла сонца за гарой.
Мінуў яшчэ адзін дакучны, шумны дзень.
Ціша... Зваліўся ночы цень...
Як міла, хараша вячэрняю парой.

Іду к табе, о, ноч сьвятая!
Пацеш душу маю—навей мне казак сны,
Я сын жыцьця, сын творчае вясны —
Я прагну лепшых дзён з красой агністай мая]

Як гэтых зораў бліск—зіхценьне,
Гараць у грудзёх маіх бунтарныя агні.
З адвагай спаткаць іду я шчасьцьця дні,—
Даволі чорных дзён—кашмарных снавідзеньняў!]

Я ў гэты момант забыцьця
Магутны чую гул мільённага народу.
Гэй, рыцары змаганьня!—чырвань сонца ўсходу]
Зігціць ўжо збаўчымі праменьнямі жыцьця...]

А там... там воля, браце мой!
Сьмяяцца будзе нам краса вясны—свабода!
— За працу цяжкую, за зьдзекі нагарода...
Зьмяцецца сьлед пакут...

М. Васілёк.

Радыкалізм у Японіі.

Досьць толькі прагледзець вынікі астатніх выбараў у ўставадаўчыя палаты ці самаўрады ў так-званых „дэмакратычных“ дзяржавах, як нямыя лічбы галасуючых за левыя сьпіскі красамоўна падцьвярджаюць факт радыкалізацыі масы.

Маса лявее. Гэтага ня можа запярэчыць самы кансэрватыўны абсэрватар сучаснага жыцьця народаў.

Абмінаючы абгаварваньне прычын гэтага факту, да якіх бязумоўна трэба залічыць разьвіваючуюся сьвядомасьць працоўнага люду, які імкнецца да зьдзейсьненьня ў жыцьці сваіх ідэалаў, мы кінем вокам на радыкалізм у Японіі.

Японія—край з рэзка акрэсьленымі клясавымі і каставымі асаблівасьцямі, пасьля Вялікае Сусьветнае Вайны, выцягнула з агалочаных ваюючых дзяржаў шмат багацьця, якое пацякло ў кішэні розных „прадпрынімацеляў“.

Маса, сам працоўны народ, калі ад вайны і не пацярпела, дык ад яе нічога і ня выграла. Работнікі ў гарадох, сяляне на карлікавых кусках зямлі, як раней вялі паўгалоднае існаваньне, пры такім яны асталіся і пасьля вайны. Эміграцыя па-за бацькаўшчыну спынілася, дзякуючы забароне Паўночнай Амэрыкі выяжджаць туды падданым Японіі. Ад гэтага працоўнаму люду яшчэ пагоршыліся ўмовы жыцьця. А тут побач—пыха, азіяцкая роскаш сярод арыстакратыі і маладой японскай буржуазіі.

Японскі работнік і дробны селянін абвясьцілі гэтай пысе і роскашы „вайну“. Разумеючы, што пасьпех гэтага змаганьня залежыць ад арганізаванасьці працоўных, работнікі і сяляне сьпешна пачалі арганізавацца ў свае прафсаюзы, каапэратывы і г. д. На эканамічны ўціск пануючай клясы яны адказалі забастоўкай. Шмат перамог, ня гледзячы на дзікія выбрыкі паноў палажэньня, аказаліся на баку работнікаў.

Японская кляса абшарнікаў і капіталістаў спалохалася за заўтрашні дзень. Каб ня здаць аканчальна ўсе свае пазыцыі, Японская Рада (ўстанова пры Мікаду—японскім цару), якая складаецца з „прывілігіраваных“ грамадзян Японіі, сьпешна апрацавала новае права адносна грамадзян „непрывілігіраваных“. Гэтае права мае лячыць японскі радыкалізм і павярнуць гісторыю назад. Новае права пад назовам „Права для захаваньня супакою“ дамагаецца для кожнага камуніста кары сьмерці. У абшырным мэморыяле да Мікады яно дамагаецца грунтоўнай школьнай рэформы з выдаленьнем са школы ўсіх „небясьпечных“ вучыцялёў, якія глядзяць на жыцьцё ня праз абшарніцка-капіталістычную прызму. Гэтае права дае строгі прыказ паліцыі пільна сачыць за асобамі з радыкальнымі паглядамі і „ўсімі спосабамі ізаляваць“ іх ад масы і выдаліць з краю тых расейцаў, якія ўтрымліваюць стасункі з японскімі прафэсыянальнымі таварыствамі. Нарэшце, „скромны“ загад паліцыі—рэгістраваць усіх сымпатыкаў радыкальнага руху.

Няведама, ці намогуць гэтыя „лекі“ утрымацца японскаму кансэрватызму ў ўлады, і як надоўга, але ў аканчальнай перамозе працоўнага люду ў Японіі няма сумліву. Кола гісторыі не павернеш назад.

Наша хроніка.

Беларуская мова. Апошнімі днямі ваяводзкі ўрад у Навагрудку зацьвердзіў пастанову навагрудзкай Гарадзкой Рады ў справе ўвядзеньня ў навагрудзкім магістраце беларускай мовы нараўне з польскай.

Новая беларуская часапіс. Як інфармуе „Кур. Віл.“ (№ 190), у Вільні ў хуткім часе будзе выходзіць новая беларуская часапісь, грамадзка-царкоўнага характару, пад тытулам „Скарб Беларуса“.

Рэдактарам „Скарбу“ быццам мае быць вядомы з працэсу „Грамады“ сьвяшч. Коўш.

Пэўна і гэтаму „скарбу“ ня доўга прыдзецца чакаць на долю папоўскай „Праваслаўнай Беларусі“...

На кангрэс меншасьцяў. У хуткім часе мае адбыцца кангрэс нац. меншасьцяў у Жэнэве. Ад беларусоў туды едзе Сель-саюзьнік п. Ярэміч. Літоўцы, як падае польская прэса, свaей дэлегацыі не пасылаюць з няведамых прычын...

А прычыны тут хіба ўсім ведамыя: нічога гэтая канфэрэнцыя нацыянальным меншасьцям у Польшчы ня дасьць, як і раней не дала.

Выпусьцілі на свабоду. 13/VIII—28 г. з Вялейскай турмы выпусьцілі на свабоду наступных асоб: 1) Канапелька Сяргей, 2) Лявіцкі Даніла, 3) Казакевіч Вінцук, 4) Канапелька Якуб, 5) Марзак Васіль і 6) Сьліж Васіль.

Галадоўка ў Вялейскай турме. 3 жніўня г. г. ў Вялейскай турме была абвешчана

— Ды не, там апарат толькі, а ён у сярэдзіне—слухай!

...Мілы... мілы... ёсьць часэм „пенкны“, навет „ладны“... Мілы выраз твару... мілы ўсьмех...—няслося з той „скрынкі“.

А вось, што ж тут, думаю, такое? Якая-ж гэта палітычная табе прамова? Э-эх!—спазьніліся! Гэта ўжо артысты гуляюць там нейкую любоўную драму.

— Што там гавора?

— А ці-ж, васпан, ня чуеш?

— А дзе ле зразумееш! Я, брат, папольску а ні ў зуб—ня кемлю!

— І я ня ведаю! Гэта мусіць ня Пілсудскі, а артыст нейкі гавора.

— А пан запытай у каторага!

Аглянуўся я кругом, у каго тут запытаеш? З нашага брата нікога ня відаць, а да гэтых цыліндраў стыдаюся, неяк боязна.

Так і топаем, ня ведаючы слухаць, або ня слухаць, ён, ці ня ён?—а радыё тым часам жарыць:

— ...Над галавой стаіць кат, над душой сьвішча бат і чалавек мусіць з гэтым мацавацца...

Гэта, думаю праўду гавора, але да каго і да чаго яно сказана — нічога не разумею.

— А што гэта ён пра бат нешта ўспамінае? Можа тут нас пачнуць сьвяньціць!?— устрывожыўся мой сутаварыш.

— Ня бойся! — успакайваю.—За што-ж, мы-ж спакойненька... як і людзі!

А прамоўца пачаў пра вясну нешта апавядаць, аб тым, што вясной і на сухіх вербах растуць грушы, усё зеляней, чалавек маладзее, бадрыцца. — Многія—кажа—з вас раней ня мелі „тлушчу“, былі зусім лёгкімі, рэзвымі, а цяпер, дзякаваць Богу, адгадаваліся, многія пасівелі з вас... — сказаў нейкі верш. Расказаў пра вайну на Палесьсі, аб тым, як там плакаў малады жаўнерык, усьпёршыся на вінтоўку, пра гусей палескіх, балоты.

— Эх-хэ-хэ!—уздыхнуў Антось. — Вось ён успомніў нешта пра вясну, мусіць спагадае, як труднаенька нам было перажыць яе сёлета! — А на лета яшчэ горэй будзе — зімна, усё ад'залена, адмокла, як падумаеш, дык хоць ты загадзя жывы ў зямлю лезь!—

— Ды ён не пра тое, брат! —

— А пра што? —

— Не перашкаджай, пасьля раскажу!—

— ...„Аглянуўся я і пайшоў у буфэт—няслося з радыё — там мяне абступілі афіцэры, сяржанты і давай частаваць. — Мы крычаць — за Каманданта заплацім!—Ішла водка за лікёрамі, лікёры за водкай, усе навакол дзівіліся, што я такі чыста ўсіх перапіў, бо-ж моцную галаву на гэта маю“!...— Брава!!! Біс!!! Го-го!!! —

— Антон, кажу, гэта мусіць такі ён гавора, чуеш, як крычаць „брава“?—

— А аб чым ён гавора? Можа зямлю дзяліць будуць? Вось было-б добра, а то-ж ужо гэтак далей проста трываць не магчыма! Дзе не павярніся—панскае, а той у суд, каб на яго грымоты!...

— Не, пра гэта і не ўспамінае! Пачакай нешта цікавае!... —

— ...„Як сядзеў у Магдэбургу, нада мной стаяў кат, ня быў ніколі пэўны свайго жыцьця. Як у гробе якім усё роўна — адцяты ад сьвету, людзей і тагды думаў“...

— Сядзеў... кат... — бубніў Антось падхопленыя словы.—Што ён кажа сядзеў, гдзе сядзеў, у турме? —

— Але ў турме. —

— А што там яму хацелі галаву адсеч?

— Ня ведаю, мусіць гэтак! Кажа, кат стаяў над ім, было сумна, дрэнна. —

— Эх, вось і мой пляменьнічак Грыгорка ўжо другі год сядзіць! Піша, кроў ідзе з горла — мусіць ня выжыве, бедны! Каб хоць хутка выпусьцілі, а то-ж яшчэ больш году мае, гаротнічок, пакутаваць! А можа іх хутка выпусьцяць, нічога ён аб гэтым ня кажа?

— Не, аб гэтым нічога! —

Тут пайшла гутарка пра Вільню: — ...Мілы горад, пекны! Распалажыўся сярод зялёных пагуркаў. Шмат касьцёлаў, званы б'юць, як-бы скардзячыся на нейкую людзкую несправядлівасьць. Тут я, будучы хлапчуком, хадзіў вучыцца у праклятую расейскую школу. Тут мяне вучылі любіць праўду(?) і не рабіць людзям крыўды(?!)... —

Думаю, пайшла такі, чалавеку, на карысьць навука „праклятае школы“! — Далей аб тым, як на Вельканац легіянэры забіралі Вільню, каб зрабіць свайму каманданту прэзэнт за які многія заплацілі сваім найдаражэйшым скарбам — жыцьцём.

— Там на Россе (магільнік у Вільні) ляжаць яны, быццам і пасьля сьмерці трымаючы сваю жаўнерскую дысцыпліну, адзін пры адным у шарэнгах! Ляжаць тыя, якія сваё жыцьцё аддалі, каб пацешыць сэрца свайго Каманданта. З гэтым местам вяжа мяне столькі пражываньняў, столькі прыемных успамінаў, што яно—„Вільно мусі быць моё“! — І Ковно здобэндзем!!! Провадзь нас Маршалку!!! Га!-га!!! га!!! — грымелі — крычэлі, мусіць, слухачы легіянеры. Калі ўспакоіліся, дык ужо Маршалак канчаў прамову:

— На заканчэньне жычу Вам, каб сягодняшні дзень нашага сьвята правялі шумна, вясёла, каб гэта места аж задрыжала ў вашым усьціску, так, як тагды, калі Вы яго, здабываючы, сюды ўваходзілі!... —

— Брава!!! Нех жые Маршалак!!! Нех жые!!! — крычэлі і пляскалі там, мусіць з наўгадзіны.

Няўжо, думаю, і сягодня Вільня так задрыжыць, як у 20-м годзе? Ня дай божа! Хоць ты ўцякай гдзе небудзь на вёску! Але-ж, думаю, не павінна, гэта-ж быў-бы скандал на ўвесь сьвет! і памалу стаў сябе ўспакайваць.

— Ну, кажу, Антон, ужо і па прамове — скончылася!—

— Эт, што-ж з яго прамовы? Гаварыў гаварыў цэлы час, а нічога і не сказаў! —

— Вось у тым то і штука, у тым і сучасная мудрасьць палітыка, каб і гаварыць і нічога не сказаць, або гаварыць адно, а разумей сабе другое — што хто хоча. А ты думаў гэта, як у вас на вёсцы — проста з мосту? —

— А пэўна гэтак ляпей, нашто напрасна язиком лапатаць! —

— Нех жые Дзядэк!!! Нех жые!!! — загрымелі ўжо на вуліцы і замахалі цыліндрамі, капялюшамі...

Антось агледаецца, круціцца, а пасьля, гавора: — Відаць, ніштo маюцца гарадзкія жыхары, наўбіраўшыся, кругленькія такія! —

Не, браток, ня ўсім і тут гэтак паводзіцца! Тут сабралася сьмятанка, „сынкі“, а вось прыедзь калі на першага мая, дык убачыш кіслае малако „пасынкаў“; увідзіш тысячы худых, сутулых, абарваных, бядных, як палатно, ад недаяданьня — малакровія! І на вёсцы пану, што ў суд вас падаў, то-ж мусіць ніштo паводзіцца?

— Ага! дык гэта і тут гэткія сабраліся!

У гэты момант радыё зайграла „мы першa брыгада“... але ахвотнікаў слухаць засталося зусім мала, раcпаўзаліся куды каторы на аўтамабілях, дарожках. Уздыхнулі мы з Антонам, быццам згаварыўшыся.

— Пойдзем — кажу — хоць па шклянцы гарбаты вып'ем! Загуляем, дзеля такой „урачыстасьці“ ды яшчэ на 20-ць грашэй кіслага малака сербанём! Усё роўна заўтра есьць нечага, калі ня ўдасцца гдзе „стрэльнуць“! —

— Пойдзем сабе... —

Цягнемся маўчком, папусьціўшы галавы, толькі мой Антось сапіць у нос і ўсё нешта цяжка — цяжка, уздыхае...

Янка-Пятрок.

Некалькі мільёнавая „армія“.

„Rzeczpospolita“ ў № 241 піша:

„Варшава мае ў гэты момант каля 10 тысяч „легальных“ прастытутак (nierządnic), „не легальных“ — ёсьць два разы гэтулькі. Гэта ёсьць лік аграмадны, лік страшэнны, якога хопіць для заразы ня толькі мільённага места, але цэлага народу. Вось дык „армія“—каля 30-ці тысяч і ў адной толькі Варшаве, а ў другіх местах Польшчы, Францыі і г. д.? Можна з пэўнасьцю сказаць, што іх зьбярэцца мільёны! Гэта — нішто іншае, як вынік цяперашняга капіталістычнага ладу. Кабета ў ім мае хіба найгоршае палажэньне. Безрабоцьце выкідае іх сотнямі на брук, якіх хопіць, каб заразіць і пацягнуць за сабою цэлыя тысячы і, як піша ўспомненая газэта, цэлы народ.

Для ратаваньня свайго жыцьця, для таго, каб ня ўмерці з голаду, безработная ідзе да таго, хто мае грошы, хто можа купіць яе цела.

Капітал усё купляе: і цела і душу.

Няхай гэты абразок яшчэ раз напомніць жанчынам аб тым, што яны ўсе мусяць арганізавацца, уступіць у сялянска-работніцкія арганізацыі і разам з сваім братам, мужам, сынам ісьці змагацца за лепшы, справядлівейшы лад на сьвеце, дзе-б усе мелі працу, належную плату за гэтую працу, дзе ня можна было-б купіць чалавека—чалавекам.

П. Ж.

галадоўка, як пратэст проці ўціскаў адміністрацыі. Галадавала ўсяго 47 вязьняў палітычных і некалькі крымінальных. Было ўжывана штучнае кармленьне.

Геройская забастоўка хімічных работнікаў. У Пінску работнікі хімічнае прамысловасьці, якія працуюць на сярніковай хвабрыцы ў ліку каля 450 асоб, ужо мінула 2 месяцы як бастуюць. Нягледзячы на тое, што фабрыкант да гэтага часу не здавольніў іхняга трэбаваньне, сярод работнікаў пануе бадзёры настрой.

Прычына забастоўкі—падвышка зарабковай платы дзеля дарагоўлі.

З забастоўкі сталяроў. Апошнімі днямі частка гаспадароў сталярняў у Вільні згадзілася на жаданую бастуючымі работнікамі падбаўку. Работнікі ў гэтых сталярнях ужо працуюць.

Астальная-ж частка прадпрыемцаў не згаджаецца на падбаўку сваім работнікам і навет і „хшэсьцьяне“ і жыды прадпрыемцы наладзілі спэцыяльна ў гэтай справе супольную конфэрэнцыю, на якой пастанавілі ня ісьці „ні ў якім выпадку“ на кампраміс з „забастоўшчыкамі“.

Паглядзім, хто ў каго папросіцца?

Камуністычныя „тэхнікі“. Польская прэса (K. W. 192) піша, што на радава-польскім пагранічны, у раёне Каласова арыштавана трох „камуністычных тэхнікаў“, пры якіх знойдзены рад камрамітуючых і абцяжаючых дакумантаў.

Пасьледзтвы даждžоў. Частыя апошнія дажды нарабілі многа бяды і клопату нашым сялянам, заліваючы жніва і сенажаці. У некатарых кутках Зах. Беларусі, як напр. ў Крулеўшчыне (Дзісьненшчына), дажды залілі цэлыя палеткі. Асабліва пацярпела мясцовасьць каля станцыі Зябкі, дзе вада перайшла й праз палатно. Гэта змусіла мясцовае сялянства да збудаваньня спэцыяльных плытоў і чаўноў, на якіх толькі і магчымы які колечы рух.

„Сялянка“ без адказных рэдактароў. Як усім ведама, орган Беларускага Сялянскага Саюзу—„Сялянская Ніва“ даўно ўжо як ня выходзіць, пэўна з браку... чытачоў дый што да новых выбараў яшчэ далёка. А знача, хай беларускім сялянам будзе іх час (пэўна на піцьцё гарэлкі)?!), а лідэрам „Сель-Саюзу“ іх грошы (на 45о ды на „гэктары“),—так гэта тлумачаць віленскія беларусы.

Але „Кур. Віл.“ у 190 нумары прычыну гэтага бачыць у тым, што „Сялянская Ніва“ „часта“ канфіскуецца, і за некалькі канфіскатаў кожны яе адказны рэдактар садзіцца ў вастрог (?), дык бачычы гэта, няма „аматараў“ на адказнага рэдактара „Сял. Нівы“.

Ня можна тут не запытаць, хто з рэд. „Сял. Нівы“ сядзіць ці сядзеў у вастрозе? Дый хто будзе садзіць сваіх слуўжкаў у вастрог? На іх толькі дзеля большай папулярнасьці ўлады трохі паківаюць пальцам дый усё...

Бясумліўна тут зусім іншыя прычыны—аканчальнае скампраміταваньне ў вачох беларускага сялянства і работніцтва, якое зразумела агідную працу „шчырых беларусаў“, хаваючыхся пад фірмай Хрысьц. Дэмакратыі і Сельсаюзу.

Абакралі жыдоўскую школу (сынагогу). 22 г. м. зладзеі абакралі жыдоўскую школу ў Маладэчне. Здабычай зладзеяў сталіся 3 экзэмпляры Торы, вартасьці 15 тысяч злотых.

Апошнімі днямі справа выкрыта, і зладзеяў арыштавалі аж у Слоніме. Былі імі нейкія 2 жыды—Есель Козірог і Есель Гузка і іх жанкі.

Арыштаваныя разам з украдзенымі рэчамі перавезены ў Маладэчна.

Рабункавае забойства. 24-га жніўня няведамымі зладзеямі забіты жыхар засьценку Лясныя Суднікі, Шумскай вол., Віл.-Троцкага павету. Забойцы напалі на яго за паўкілямэтра ад яго дому.

Той-жа ноччу ў забітага ўкрадзена карова, што прыпушчае думку аб рабунковым характары забойства.

Атруціліся газам. 24 г. м. ў памешканьні на першым паверсе на Ашмянскай вуліцы (ў Вільні) атруціліся выходзячым з раскопанай вуліцы сьвяцільным газам 7 чалавек.

Атрымаўшы першую лякарскую помач, 5 з іх засталося дома, 2 ў цяжкім стане перавезены ў жыдоўскі шпіталь.

„Nauczanie ludności“. Ад 20 г. месяца ў Навагрудзкім ваяводзе распачаўся тыдзень „nauczanie ludności przestrzegania przepisów na drogach publicznych“.

Навучаньне гэтае, піша „Kurjer Wileński“ ў 190 н-ры, адбываецца наступным спосабам:

Пастарункі высылаюць на ўсе дарогі пешых і конных паліцыянтаў (а яшчэ кажуць, што на „крэсах“ мо' іх мала), якія там і будуць вучыць сялян: „чаго трэба ўнікаць і што трэба рабіць“, каб не папаесьці ў „kolizję“ з распараджэньнямі аб дарогах.

Хіба-ж нашы сяляне мала навучаны пратаколамі і штрафамі?

З Т-ва Бел. Школы.

Што значыць Гурток Т-ва Бел. Школы у беларускай вёсцы!

(Маленькая справаздача Гуртка Т-ва Беар. Школы ў в. Востраве, Слонімскага павету).

У сёлетнім годзе наш Гурток Т-ва Бел. школы зладзіў ужо 5 спэктакляў і гатовіць даць яшчэ два. Ёсьць бібліятэка-чытальня, якая налічвае 300 кніжак.

Гурток робіць маральны ўплыў і ўзгадоўвае вёску. Цяпер п'янства амаль што зусім няма. Калі які смаркач і нап'ецца, дык стыдаецца паказацца на вочы, бо абсьмяюць яго. Цьверазасьць уваходзіць у жыцьцё моладзі. Мацярныя словы і няпрыстойныя лаянкі — значна зьмяншаюцца. Павялічваецца ветлівасьць і пашана адзін да аднаго. Вёска, хоць і ў дрэнных эканамічных умовах, паволі культывізуецца. Разбоі бываюць зусім рэдка. У многіх сяброў знаходзіцца нябываласая актыўнасьць, самаахвярнасьць і салідарнасьць. Эгаізм — паволі зьнікае. Незаўважна навакол бруднае паветра ачышчаецца.

Газэта нашага радыкальнага напрамку становіцца найлепшым другам кожнага.

Калі параўняць жыцьцё прошлых 3 ці 4-ох гадоў, дык заўважваеш аграмадную розьніцу.

І думаеш: **Не прапала наша праца надарэмна і праца Тых, якіх сёньня з намі няма!**

Дык, сябры! Арганізуйцеся ў Гурткі Т-ва Белар. Школы. Усоўвайце з дарогі да асьветы ўсе перашкоды... Сябра.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Працірайма вочы.

На шпальтах працоўнай газэты, як у калейдэскопе, можна прагледзець гісторыю гэтых апошніх гадоў, гісторыю адраджэньня беларускіх працоўных мас, іх волю, усьведамленьне. Бачым, як месты, мястэчкі, вёскі адзін па аднаму, адна па адной устаюць ад векавога сну, імкнуцца да свайго вызваленьня на шлях лепшага заўтра. Асабліва ў апошнія часы выявілася імкненьне вызваліць хоць часткова сьвет працы з пад цемры, якая праз многа гадоў заняпаду, збудавала вялізарную крэпасьць свайго панаваньня з жывога цела гэтага народу.

Нашаму селяніну стала зразумелым усё гэта, а асабліва тое, што сколькі ён траціць у сваім жыцьці—змаганьні па ўсіх галінах і толькі таму, што ён ёсьць цёмным і вось дзеля гэтага ён імкнецца, каб выбрацца самаму і даць асьвету дзеткам.

Радасна бачыць, як на вачох расьце масавая арганізацыя Т-ва Бел. Шк., як селянін саматугам бярэцца за самаасьвету і гэтым зблізжаецца да свае будучыны, пракладвае, хоць з непамернымі высілкамі, гэты шлях у надзеі на яе—гэтую будучыню.

Аднак, радуючыся наагул, ня можна парадавацца часткова: шмат ёсьць вёсак (як напр. наша—Харашкі Навагр. пав.), якіх не ахапіў гэты рух, няма імкненьня вызваліць сьвет працы ад рознага роду ўціску, хоць напр.—у даным выпадку—няма імкненьня да асьветы. Шмат у якіх вёсках няма ні Гуртка Т-ва Бел. Школы, які зьяўляецца адзіным рассаднікам асьветы сярод беларускіх працоўных мас, ні чытальні-бібліятэкі, ні радыкальнай з сялянска-работніцкай ідэалёгіяй газэты, якая ўсьведамляе працоўных, ні, разумеецца, роднай школы, а толькі польская, якая роўна нічога не дае і даваць ня будзе нашым дзеткам.

І вось здаецца, што нічога няма! Але з другога, кепскага боку тут знойдзеш многа ўсяго і многа, многа, аб чым нyварта мо' й гутарыць.

Чаму-ж гэта так?

Адказ будзе просты.

Наш селянін, як і ўсе сяляне нашае бацькаўшчыны, вякамі, пераходзячы ад бацькі да сына, ад дзеда да ўнука, быў у цемры. Вечна галодны, ня маючы кавалка хлеба, ня маючы на чым зарабіць яго, ня маючы варштата працы—кавалка зямлі, навокал абсаджаны абшарнікамі з іх вялікімі маёнткамі, пагразь увесь у бядзе, увайшоў, замкнуўся сам у сабе, думаючы толькі аб тым, як дастаць кусок хлеба.

Падыйсьці-ж да яго, клікаць яго да змаганьня за свае чалавечыя правы ніхто амаль не хацеў. Усю тую нядолю, якая лягла на яго карку, нёс ён у карчму, якая заўсёды была яму даступная, і там залівуў сваё гора атрутай, каб забыцца і ня думаць аб тым, што яго мучыла. Чарка — была таварыш яго нядолі!

Уся гэтая спадчына перайшла і сучаснаму гаспадару нашае вёскі, а асабліва чарка, якая таварышуе нашай моладзі і навет маладым бацькам.

Такія бацькі ня могуць зразумець тое, што дзетак іх чакае калецтва ў чужой школе, іх нічога не абходзіць, што яны спавітыя цёмрай, якую атрымалі ў спадчыне, і якую перадаюць сваім дзецям.

— Ну што-ж: хай будзе як ёсьць. Нічога ня зробіш! Вельмі добра было-б, каб у нас была родная школа, каб быў Гурток Т-ва Бел. Шк., каб атрымоўвалі сваю газэту і г. д., але хто гэта ўсё зробіць!“ — вось што кажуць.

Апрача таго, ёсьць шмат такіх-жа беднякоў, як другія, але „захварэлі на паноў“, хочуць сваіх дзетак выкіраваць на „паночкаў“ і гэтым не даюць усім, як адзін, змагацца за родную школу, якая не калечыла-б дзяцей, але навучала-б і рабіла-б з іх ня тых „паночкаў“, аб якіх многа бацькоў так солодка марацъ, але тых барацьбітаў за лепшае жыцьцё, ня толькі сабе, а цэлага працоўнага народу.

Праўда, часам з высілкамі падаюць дэкларацыі, а потым усё ізноў заміра, бо няма арганізаванасьці, няма тае сілы — арганізацыі, іменна: Гуртка Т-ва Беларускае Школы.

Дык браты сяляне! Досыць ужо гэтае цемры, досыць паняверкі самых сябе ў гэткай адарванасьці—кожны для сябе,—або хай „вучыцца“ там, дзе „вучаць“ і думкі аб тым, што вийшаўшы з польскае школы, „паночкам“ будзе, бо яны ня будуць разумець сваіх бацькоў, не адчуюць яго гора і бяды! Пара кінуць гэтую спадчыну нашага над'ярэмнага жыцьця—цемру. Паглядзіце, як навокал людзі—нашыя-ж браты!—гэткія самыя як і мы, прабіваюцца да сьвету. Яны арганізоўваюць Гурткі Т-ва Белар. Школы, ладзяць спэктаклі, закладаюць бібліят.-чытальні і г. д.

Дык, там дзе яшчэ цёмна, схапіцеся ўсе разам, як адзін, за асьвету! Пабачыце, што адкрыюцца тады вам вочы на яе адно!

Дуброва.

Нам пішуць яшчэ, што:

× **У м-ку Дзярэчыне, Слонімскага пав.** тыя панкі, што трымаюць рэстаўрацыі і іншыя „інстытуцыі“, скардзяцца, што малы маюць даход з гарэлкі. Было ўсяго 4 рэстаўрацыі—цяпер тры: адна лопнула, затое чайных было толькі нешта дзьве, а цяпер сем.

Гэта сьведчыць аб тым, што сяляне з суседніх вёсак арганізаваліся ў Гурткі Т-ва Бел. Шк., так што п'янства спыняецца.

А ўсё „кажуць“ нам пакінуць Т-ва Бел. Шк., а закладваць „T-wo Domu Ludowego! Дык дзе-ж тут здаровы розум?

× **У вёску Ахонава, Навагрудзкага пав.** 19 жніўня г. г. прыехаў „слаўны спадар“ Я. Станкевіч. Зажадаў ён склікаць некалькі асобаў, каб заложыць „сябрыню“. Прыйшло некалькі чалавек, але... ніхто не згадзіўся запісацца, бо **лічаць яго за разьбівача і панскага ўгодніка.**

Нам, сялянам трэба гуртавацца каля сваіх паслоў, якія ўваходзяць у склад Сялянска-Работніцкага Клюбу!

× **З м. Беластоку гр. М-к** хоча падаць да ведама, што кінуўшы п'янства і курэньне, за тры месяцы сабраў 55 зл., якія паслаў у Беларускі Каапэратыўны Банк.

Няхай гэтая ашчаднасьць будзе прыкладам для тых, якія яшчэ марнуюць грошы на тытунь і гарэлку.

× **У в. Палавецкая-Пяшчатка, Берасьцейскага пав.** сяляне пазбаўленыя амаль зусім мэдыцынскае помачы. Ёсьць за якія 12 вёрст доктар, дык трудна прыступіцца, бо ня мае часу, а дзе ж вязьці за 12 вёрст хворага?

Відаць гэта „ім“ не ў галаве, а падаткі давай!

З жыцьця Горадні.

× **Забастоўка.** Работнікі хімічнай прамысловасьці, якія працуюць на серніковай фабрыцы ў ліку каля 160 асоб на агульным сходзе 20-га жніўня с. г. вынясьлі пастанову распачаць з 23-га жніўня забастоўку. Дзеля гэтае мэты на гэтым сходзе застаў выбраны забастовачны камітэт, які будзе кіраваць вось гэтай забастоўкай.

Прычыны, якія змусілі работнікаў на гэтакі шаг—дрэнная зарабковая плата, якую яны атрымліваюць за працу, дый дамаганьне, каб фабрыкант даў працаваць 6 дзён у тыдзень, а ня 5, як было да гэтага часу, (бо фабрыкант зумысьля ня хоча каб работнікі працавалі 6 дзён у тыдзень) і зразумела, бо як ведама, у суботу працуюць толькі 6 гадзін, а гэта для эксплёататара няма выраховаваньня.

× **Нявінная ахвяра мілітарызацыі.** Апошнімі днямі, спацыруючы над Нёманам каля Каложы малады хлапец Юрка Макарэўскі знайшоў снарад, паходжаньня з часоў апошняй вайны, ды зачаў сабе каля яго майстраваць. У часе вось гэтай „працы“ снарад разарваўся і вельмі цяжка раніў хлапца — ахвяру выпадку бяспрытомнага адвязьлі да шпіталю. Натуючы, вось гэты, здаецца ня першы факт, папераджаю грамадзян, каб здалёк абходзілі такія рэчы, бо шмат яшчэ можна знайсьці ў ваколіцах Горадні такіх „цацкаў“ розных фірмаў і калібра.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Пав. гр. Рэдактар! Не адмоўце надрукаваць у Вашай пав. газэце наступнае:

Я, па волі лёсу, маю вялікае няшчасьце ў сваім жыцьці, а іменна: маю 14-цігадовага сына, захварэўшага, будучы грудным яшчэ дзіцем. Хворы, што-раз, то болей робіць мне клопатаў. Я чалавек бедны, просты і ўдавец. Маю такія цяжары, што толькі хіба адзін Бог бачыць і добрыя людзі. Хворы заўсёды б'ецца аб зямлю, дзе куды ні папала: у вагонь, у ваду і г. д., бяжыць у поле, лес і г. д. Шмат каго з маючых уладу я прасіў, але словы мае прыстаюць, як гарох да сьцяны. Закончыў просьбу ў Вялейскага старасты, які сказаў, што „бэндзе зробёно роспожондзэне“. Праўда, выпаўніў свае словы ганарова: „натыхмяст“ прыслаў паперку, аб'яўляючы мне пад расьпіску (бачыце: ўсе фармальнасьці), што, „як бэндзе мейсца ў шпіталю, втэды бэндзе вэнты“. Але я, як пакутаваў дагэтуль, пільнуючы кожны дзянёк, кінуўшы работу, каля хворага, і кожную ночку, амаль-што, зусім адказаўшыся ад сну, дык пакутую і цяпер. Відаць, не дачакацца мне таго, каб словы п. Старасты Вялейскага пав. сталіся фактам у даным выпадку.

Мне толькі дзіўна, як гэта можа быць, калі ў цэлай дзяржаве столькі шмат „інстытуцыяў“, дзе „садзяць“, не знайшлося мейсца для такога хворага, на чыны каторага больш брыдка глядзець, чым на якога небудзь „антыпанствоўца“. А можа той, каму трэба, ня ведае аб гэтым? Можа гэтага патрабуе культура XX-га веку, каб заўсягды лазіў народ па палёх ці лясох хворага? А можа мая мужыцкая просьба не да спадобы? Ці можа гэта дзіця беларускага хлопа? і г. д. і г. д. Словам, я ўжо ня маю сілы і цярплівасьці прасіць больш таго, хто з нашых падаткаў бярэ сабе пэнсіі, а служыць нам ня хоча, лічучы сябе не за слугу народу, а за пана народу. І вось я рашыў зьвярнуцца з ветлівай просьбай праз Вас, пав. гр. Рэдактар, да нашых выбранцаў-паслоў Сойму, просячы заапекавацца лёсам майго няшчаснага сына Івана Андрэевага Шарамэта.

Андрэй Шарамэт.

Ліпень 19-га дня 1928 г.

Ад Рэдакцыі. Вашую просьбу перадалі ў Беларускі Сялянска-Работніцкі Клюб.

Паштовая скрынка.

Агню. Ваш верш-фэльетон, на жаль, ня можа быць выкарыстаны. Справа ў тым, што ў нашых абставінах да мастацкіх вартасьцяў фэльетону (лёгкі стыль, гумар, сатыра і г. д.) належыць яшчэ ўменьне пісаць так, каб і добра і не канфіскавалі. Вось-жа Ваш першы фэльетон ня мае гэтае апошняе „мастацкае вартасьці“, бо за яго могуць канфіскаваць газэту. Так наагул добры. Прабуйце яшчэ. — **Я. Круку.** Ваш „Фэльетон“, як Вы яго завеце, да друку ў газэце ніяк не падыходзіць; вершы таксама слабыя. Калі Вы вучань, дык зьмяшчайце іх у вучнёўскіх часопісях. З карэспандэнцыі скарыстаем. Дзякуем. — **Сялецкаму.** Аб гэтым здарэньні была карэспандэнцыя ў № 8 нашай газэты, так што другі раз зьмяшчаць ня будзем. — **Дуброве.** Вершы атрымалі. Пакрысе будзем зьмяшчаць. — **Касьтусю Лавышу.** Атрымалі! Крытычны агляд дамо асобна. — **Прысутнаму астрынцу, Нецярпліваму, Жуковічу. Я. Варановічу і Сьвядомаму.** Ад Вас усіх карэспандэнцыі атрымалі. Будзем зьмяшчаць. Дзякуем. Пішыце больш.

Рэдактар-Выдавец: Язэп Машчоньскі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.